**Фальклорны гурт вёскі Стаўбун, песні якога былі запісаны ў 1982 годзе на дыску-гіганце фірмы "Мелодыя", адсвяткаваў свае 30-годдзе.**

# Лінія жыцця




Вокладка дыска 1982 года выпуску.

"Гэтыя спявачкі рэпрэзентуюць культуру тысячадворнай вёскі... Яны ж асноўныя завадатары і арганізатары мясцовых каляндарных абрадаў. Майстэрскае валоданне традыцыйным рэпертуарам спалучаецца ў іх з чароўным, часам даведзеным да абсалюту, выкананнем. Выканальніцкі стыль гэтага калектыву ў яркай форме перадае культуру спеваў усходнепалескіх беларусаў", — пісалі пра стаўбунскі гурт у анатацыі да дыску "Каляндарныя песні Беларускага Палесся: Са збораў фанаграм-архіва Пушкінскага дома" санкт-пецярбургскія этнографы Л.Пярова і Ю.Марчанка. Дыск пабачыў свет у пачатку 1980-х, належыў да катэгорыі "гранд" — меў памер 10 цаляў (так званы "дыск-гігант") і дагэтуль з'яўляецца рарытэтам для сапраўдных эстэтаў-меламанаў, якія ўпарта "палююць" на "жывы нерв" каранёвай славянскай традыцыі, сканцэнтраваны ў этнічных спевах Беларусі.

Калектыў "Стаўбунскія вячоркі" з Веткаўскага раёна, ля вытокаў якога былі жыхаркі вёскі Стаўбун Феадора Халюкова, Аксіння Фяськова, Марыя Таранава і Зоя Буракова, быў створаны амаль адразу пасля запісу дыска Пушкінскага дома. Пасля 30 гадоў творчай дзейнасці ў яго выкананні жывуць песні, якія сталі класікай усходнееўрапейскіх фальклорных экспедыцый. У свой час, дзякуючы ім, этнографы Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кіева, Вільнюса даведаліся пра выбітную абрадавую культуру, якая захавалася на Беларускім Пасожжы і, трэба адзначыць, добра памятаюць пра яе дагэтуль. Напрыклад, больш як 20 гадоў кожную вясну наведваюць Стаўбун, асабліва спявачку Марыю Зуеву, удзельнікі шырокавядомага маскоўскага фальклорнага гурта "Народнае свята" (своеасаблівыя флагманы ўсходнеславянскага фальклорнага руху), каб паслухаць і павучыцца спяваць у мясцовых майстрых.



У час бенефісу "Стаўбунскіх вячорак", 2013 год.

Спеўны каляндар беларусаў, у які цалкам паглыблены стаўбунскія спявачкі, — сапраўдны помнік тысячагадовай культуры нашай зямлі. Як толькі людзі на ёй пачалі жыць аседла, апрацоўваючы глебу, пачалі фарміравацца каляндарныя святы. Імі першыя земляробы ўпісвалі сваю супольнасць у матчын ландшафт, магічна ўпарадкоўваючы свае адносіны з прыродай, якую яны абагаўлялі, і з продкамі, якія пасля смерці станавіліся яе часткай і на містычную абарону і дапамогу якіх носьбіты традыцыі разлічвалі. Каляндарныя песні Стаўбуна не адвольныя па форме і змесце. Яны пабудаваны на жорсткіх формулах, якія прайшлі праз тоўшчу часу і даносяць да сучаснага слухача адфільтраваныя стагоддзямі, нібыта вытрыманы, элітны напітак, водар каранёвага музычнага мыслення людзей, колер вачэй і валасоў якіх мы атрымалі ў спадчыну. Ад "Ой, Масляна-няшчаслянка...", "Вясняначка, дзе твая дачка..." і "На том баку дубы сякуць..." — песень Маслянкі і загукання цёплай пары года "на праталках" над першымі веснавымі ручаямі — праз "Як пушчу стрялу...", "Ні жар загаря..." узгадон архаічнаму, магічна-засцерагальнаму абраду "Ваджэнне і пахаванне Стралы" — да марозных урачыстых калядак "На вашам дварэ..." і "Ой, рана-рана куры запелі..." — вядуць свае інтанацыі стаўбунскія спявачкі. Гэта сапраўды эпічны шлях праз час і прастору, які спеўная грамада праходзіць штогод і які зафіксаваны навечна і ў гуказапісе, і ў "жывых" спевах Галіны Чуяшовай, Марыі Крупянковай, Марыі Гарошка, Ульяны Аніськовай, Галіны Пеўневай і іх аднавяскоўак. Апошні з узгаданых — "жывы" — варыянт фіксацыі сёння ўжо эксклюзіўны. У свеце захаваліся толькі асобныя выпадкі, калі абрадава-каляндарныя спевы каранёвых жыхароў можна пачуць "жыўцом" у такой якасці і паўнаце.



"Стаўбунскія вячоркі" на фестывалі ў Літоўскай Рэспубліцы, 2011 год.

Усё тое, што не загінула, захоўваецца, жыве, магчыма, пабачыць і паспрабаваць аднавіць на новым этапе. Сёння сярод стаўбунскіх спявачак новыя маладыя ўдзельнікі гурта — Валянціна Сяргеева і Наталля Бойка. З падачы лідара ансамбля Святланы Парашчанка "Стаўбунскія вячоркі" актыўна супрацоўнічаюць з дзіцячым фальклорным калектывам вёскі Свяцілавічы. Такім чынам, на Веткаўшчыне, дзе доўгі час фальклорная традыцыя панавала выключна сярод старажылаў, намеціліся абрысы яе пераемнасці маладой генерацыяй. Калектыў у выдатнай творчай форме. У 2011 годзе "Вячоркам" стоячы апладзіравалі Вільнюс (на Міжнародным фестывалі "Пакроўскія званы"), у 2012 — Санкт-Пецярбург (Міжнародны фестываль фальклору "Нашчадкі традыцый"). У Санкт-Пецярбургу носьбіты традыцый Веткаўшчыны спявалі ў зале Саюза кампазітараў горада, які памятае Чайкоўскага і Шастаковіча. На бенефіс "Стаўбунскіх вячорак" сёлета завіталі іх даўнія прыхільнікі і паплечнікі па святкаванні абраду "Ваджэнне і пахаванне Стралы" фальклорны гурт "Талака" спецыялізацыі "Этнафоназнаўства" са сталічнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і яго выпускніца — спявачка і этнограф з Гомеля Ірына Глушэц.



Шэсце да жыта на абрадзе "Ваджэнне і пахаванне Стралы" ў Стаўбуне, 2010 год.

Як бачым, у намаганнях па ахове традыцыйнай спадчыны Веткаўшчыны сёння ўдзельнічаюць прадстаўнікі розных рэгіёнаў краіны і розных частак сацыякультурнай сферы Беларусі і замежжа. Гэта і Міністэрства культуры, якое надала абраду "Страла" статус нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, і мясцовы аддзел культуры на чале з Аляксандрам Бандарэнкам, які наладзіў нядаўняе ганараванне гурта-юбіляра, і сталічны ўніверсітэт культуры, рэктар якога — Юрый Бондар — даслаў свае віншаванні, і студэнцкі фальклорны ансамбль, і этнографы Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы, якія штогод наведваюць веснавыя абрады Стаўбуна. Сутнасць гэтых агульных намаганняў — клопат пра каранёвую культуру Беларусі, без спадчыны якой шлях народа ў будучыню будзе няўстойлівы і няўпэўнены. Але, пакуль над Пасожжам гучыць жывы гук стаўбунскіх песень, арыенціры для самасвядомасці і самапавагі ў беларусаў мацуюцца і захоўваюцца. Таму доўгіх гадоў жыцця, творчага плёну і зацікаўленых вучняў вам, "Стаўбунскія вячоркі", носьбіты лініі жыцця архаічных песень Беларусі!



Карагод у жыце на абрадзе "Ваджэнне і пахаванне Стралы" ў Стаўбуне, 2010 год.

**Вячаслаў КАЛАЦЭЙ,**
**загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ